**Балыка А.М.**

# БАНК ЗВЕСТАК АБ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: СТВАРЭННЕ І МАДЭРНІЗАЦЫЯ

*Ключевые слова:* Беларусь, Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне, ахова гісторыка-культурнай спадчыны, Кодэкс Рэспулікі Беларусь аб культуры.

Упершыню паняцце Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь (далей – Банк звестак) было ўведзена першым нацыянальным законам у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Так, артыкулам 25 Закона Рэспублікі Беларусь 1992 года «Об охране историко-культурного наследия» вызначалася, што Банк звестак ствараецца для захавання і сістэматызацыі ўліковых дакументаў па каштоўнасцях [6]. Карыстацца інфармацыяй, змешчанай у рэсурсе, маглі толькі дзяржаўныя органы аховы гісторыка-культурнай спадчыны і іншыя асобы абмежаванага кола. Такім чынам, першапачаткова Банк звестак уяўляў сабой рэсурс выключна для службовага карыстання.

Пасля прыняцця ў 2006 годзе Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчына Рэспублікі Беларусь» [1] пастановай Савета Міністраў ад 15.06.2006 № 762было зацверджана Палажэнне аб парадку фарміравання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь і парадку азнаямлення з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў ім [2]. Дадзены нарматыўна-прававы акт *дэтальна* абазначыў мэты і парадак фарміравання рэсурсу.

Было вызначана, што ў Банку звестак на кожную каштоўнасць запаўняецца ўліковы дакумент у форме электроннага пашпарта, які павінен мець наступныя раздзелы:

- уліковыя дадзеныя і месца знаходжання каштоўнасці адпаведна Дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей - Дзяржспіс) [4];
- абгрунтаванне статусу каштоўнасці з указаннем дзеючых і страціўшых сілу нарматыўных прававых актаў, паводле якіх нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці;
- гістарычны адрас, які магла мець каштоўнасць пры яе стварэнні і ў далейшы перыяд існавання;
- характарыстыка ўласнікаў (уладальнікаў) і звесткі аб ахоўных абавязацельствах;
- інфармацыя пра адказных за правядзенне работ асоб і звесткі аб наяўнасці навукова-тэхнічнай дакументацыі на рэстаўрацыю і іншыя віды работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, звесткі аб зонах аховы;
- гісторыя фарміравання і выкарыстання каштоўнасці, кароткае апісанне і гістарычная даведка пра яе;
- характарыстыка сучаснага тэхнічнага стану каштоўнасці;
- звесткі аб элементах каштоўнасці, якія маюць самастойны статус;
- графічныя матэрыялы і фотаздымкі, у тым ліку ў розныя перыяды яе існавання або бытавання;
- архіўныя і бібліяграфічныя крыніцы.

Важным новаўвядзеннем з'явілася тое, што была прадугледжана магчымасць стварэння *сайта* Банка звестак для агульнага азнаямлення з пэўнай інфармацыяй аб гісторыка-культурных каштоўнасцях Рэспублікі Беларусь: ўліковых дадзеных згодна з Дзяржспісам і асобных ілюстрацыйных матэрыялаў.

Пры распрацоўцы Кодэкса Рэспулікі Беларусь аб культуры згаданае Палажэнне амаль цалкам было перанесена ў артыкулы 101 и 102 дзеючага заканадаўчага акта ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Больш за тое, п. 9 артыкула 102 Кодэкса аб культуры прадугледжана магчымасць увядзення ва ўжытак *пэўных раздзелаў Банка звестак у мэтах папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны.*

Галоўным недахопам існаваўшага рэсурсу з'яўлялася яго абмежаванасць: збор і адміністраванне дадзеных па гісторыка-культурных каштоўнасцях ажыццяўліся толькі адмысловым спецыялістам на выдзеленым працоўным месцы, Банк звестак утрымліваў толькі інфармацыю па дакументах на гісторыка-культурных каштоўнасцях, але не самі дакументы. Гэта прывяло да таго, што шырокае кола спецыялістаў у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны не мела доступ да інфармацыі, змешчанай у рэсурсе; дадзеныя ў папяровых і электронных пашпартах гісторыка-культурных каштоўнасцей не супадалі, альбо гісторыка-культурная каштоўнасць магла мець папяровы пашпарт і не мець электронны і г.д. З мэтай выпраўлення гэтых недахопаў у 2021 годзе была распачата мадэрнізацыя Банка звестак. Дадзеная задача была даручана спецыялістам адмыслова для гэтага новастворанага сектара фарміравання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (*аўтар дадзенага даклада на момант выканання вышэйадзначанай задачы прымаў непасрэдны ўдзел у распрацоўцы ўдасканалення рэсурсу*).

У канцэпцыю мадэрнізацыі быў пакладзены прынцып збора і адміністравання дадзеных па гісторыка-культурных каштоўнасцях не адной асобай, а шырокім колам спецыялістаў, задзейнічанымі ў сферы дзяржаўнай аховы гісторыка-культурнай спадчыны: ад дзяржслужбоўцаў да адказных асоб рай- і гарвыканкамаў. Доступ да інфармацыі, змешчанай ў Банку, ажыццяўляецца ў рэальным часе, а не па запыце ў Міністэрства культуры.

Быў створаны сайт Банка звестак з «публічнай» часткай, якая ўтрымлівае ў сабе інфармацыю пра гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь з раздзелаў Банка, уключаючы не толькі ўліковыя дадзеныя і ілюстрацыйны матэрыял, але і апісанне і гістарычную даведку [3]. Пошук гісторыка-культурных каштоўнасцей ажыццяўляецца не толькі па месцазнаходжанні і катэгорыях, але і па назве, шыфру ў Дзяржспісе, іншых элементах апісання. Для зручнасці пошуку былі ізноў уведзены ва ўжытак такі параметр, як падтып аб'екта. Сайт змяшчае інтэрактыўную мапу і раздзел навін.

Запаўненнем электронных пашпартоў гісторыка-культурных каштоўнасцей займаюцца рэгіянальныя спецыялісты, адказныя за захаванне гісторыка-культурных каштоўнацей. Гэта ажыццяўляецца праз «адміністратарскую» панэль рэсурсу, што ўтрымлівае модулі, якія дазваляюць весці улік і запаўняць электроныя пашпарты: статыстыка, гісторыка-культурныя каштоўнасці, тыпы каштоўнасцей, падтыпы каштоўнасцей, навіны.

Непасрэдна запаўненне электроннага пашпарта гісторыка-культурнай каштоўнасці, або аб'екта, які ўваходзіць у яе склад, ажыццяўляецца праз модуль «Гісторыка-культурныя каштоўнасці». Ён уяўляе сабой пералік узятых пад ахову аб'ектаў згодна Дзяржспісу. Істотным адрозненнем ад апошняга, на наш погляд, з'яўляецца тое, што Банк звестак утрымлівае інфармацыю па *кожным* аб'екце, каторы ўваходзіць у склад комплексных гісторыка-культурных каштоўнасцей (нават калі ён не мае самастойнага запісу, шыфру ці катэгорыі). Напрыклад, па гістарычным цэнтры г. Пінска у Дзяржспісе ўтрымліваецца 1 запіс (адна

каштоўнасць), а Банк звестак – 29 (сама каштоўнасць і 28 аб'ектаў, якія ўваходзяць у яе склад). Модуль утрымлівае не толькі звесткі пра дакументацыю, але і саму дакументацыю на гісторыка-культурныя каштоўнасці ў электронным выглядзе. Усе змены ў электронным пашпарце фіксуюцца адмысловым чынам, што дазваляе адсачыць, які спецыяліст і калі ўнёс праўкі.

Модулі «Статыстыка», «Тыпы каштоўнасцей», «Падтыпы каштоўнасцей» створаныя для аперытаўнага валодання інфармацыяй спецыялістамі Міністэрства культуры аб наяўнасці і стане гісторыка-культурных каштоўнасцей у рэгіёных.

Модуль «Навіны» прадугледжвае, што рэгіянальныя спецыялісты могуць напаўняць яго паведамленнямі пра культурніцкія і навуковыя мерапрыемствы, звязаныя з аховай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Такім чынам, мадэрнізацыя Банка звестак прадугледжвае не толькі папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь, зручнасць яго выкарыстання спецыялістамі і ўсімі задзейнічанымі ў гэтым асобамі.


1. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 9 ст. 2006 г., № 98-З// ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь /Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
2. Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны [Электронны рэсурс] : пастановаСавета МіністраўРэсп. Беларусь, 15 чэрв. 2006 г., № 762 // Право. Законодательство Республики Беларусь. – Режим доступа: http://www.levonevski.net/pravo/norm2013/num32/d32647.html. – Дата доступа: 20.09.2023.
3. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://heritage.gov.by/. – Дата доступу: 15.09.2023.
4. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://gosspisok.gov.by. – Дата доступу: 13.09.2023.
5. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры[Электронны рэсурс] : 20 ліпеня 2016 г., № 413-з : у рэд. ад 18 ліп. 2007 г.
6. Об охране историко-культурного наследия : Закон Респ. Беларусь от 13 нояб. 1992 г. №1940-XII [Электронный ресурс] // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь /Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.


**Баранова У.С.**

## ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОЕ НАСЛЕДИЕ В ПЕРСПЕКТИВЕ ПРОИЗВОДСТВА ПРИСУТСТВИЯ

*Ключевые слова:* историко-культурное наследие, историческая память, культура присутствия, производство присутствия, руина.

Герольд новой культурной чувствительности Х.У. Гумбрехт предлагает современной постмодернистской гуманитаристике сменить привычный фокус с производства значения на производство присутствия. Главная сложность, однако, состоит в том, что Гумбрехт обозначает лишь контуры возможных исследований, предоставляя самим учёным действовать в конкретных ситуациях сообразно с тем присутствием, которое они переживают [1, с.62].

Для исследований историко-культурного наследия и исторической памяти как социальных феноменов метод производства присутствия (если осмелиться назвать это методом) представляет существенный интерес. Это отмечает и сам Гумбрехт, посвящая вопросам истории отдельную главу в своей программной работе [2, с.121]. При этом сложно представить более близкую и в то же время далёкую от «присутствия» тему, чем историческая память. Поскольку она направлена на то, что в настоящий момент отсутствует, но при этом использует большой кор-